## Валодзя

З таго дня Валодзя Іванюк, калі ён упершыню паддаўся сумненням, ці ў ягоных вачах ёсць, прынамсі, адна іскрынка ад вачэй старога Уладзіміра Іванюка, часцей пачаў гасцяваць у сшытках, запісаных доўгімі дзесяцігоддзямі. Гартаў старонкі, перачытваў асобныя словы і радкі. На адных радках ягоны твар закрывала чорная хмара, на іншых вусны расхіляліся ва ўсмешцы, яшчэ якія пераскокваў абыякава, не паглыбляючыся ў нутро літар. Часам заходзіўся гучным рогатам. Тады бесцырымонна вырываў лісток і кідаў яго ў печ. “Дурніца якаясь. Так не было, бо не магло так быць. Няўжо гэта я запісваў?” – папракаў сваю маладую наіўнасць.

Вечарамі на доўгія хвіліны ён спыняўся каля люстэрка. Абмацваў пальцамі нос, шчокі, вусны. Абапіраючы падбародак на ўказальны палец, нерухамеў у саноўнай позе. “Напэўна ж не абы-хто я. Такі твар не даюць першаму сустрэчнаму”, – сумненні падступалі хвалямі і прымушалі яшчэ глыбей зазіраць у сябе. І чым далей у сябе заходзіў, тым больш пытанняў выносіў, вяртаючыся назад. Часам сустракаўся ў люстры з тварамі братоў. Былі звычайныя,

будзёныя, як і ўсе астатнія ў Мястэчку. “Чаму такая вялікая розніца між намі?”, – здзіўляўся.

Аднойчы вечарам, калі зайшла да нас бабка Сонька, Валодзя спытаў, быццам мімаходам, не зводзячы вачэй з шкляной роўнядзі:

– Мама, а які быў пан Драгабыцкі?

– Пан Драгабыцкі?.. – не адразу зразумела, пра што яе пытаюць. – Ах, пан Драгабыцкі... Працаваў там твой бацька. Фурманіў, пакуль не пажаніліся мы. А пан аказаўся нядрэнны, нават ялавіцу не пашкадаваў яму на добры пачатак. Госпадзі, як даўно ўсё тое...

Шукаючы шлях да сябе сапраўднага, Валодзя забягаў у старыя фатаграфіі. Было іх няшмат і, кпінай лёсу, самая зараз важная, самая жаданая канула як камень у ваду. Гартаў папкі, тоўстыя ад усялякіх папераў, раскопваў шуфляды і паліцы. Рукамі адчаю ныраў у кішэні старой вопраткі, забытай, дажываючай век на гарышчы. Траплялася ў рукі ўсё, ды – як звычайна ў жыцці – не тое якраз, што шукаецца. Аднойчы крадком залез у куфар бабкі Сонькі, які мог быць равеснікам свету ды прыхоўваць пад счарнелым векам усе таямніцы сям’і. Дарма. Апроч вытканай на кроснах капы, нічога там не знайшлося.

А тую фотакартку прыпамінаў з дзяцінства. У старой хаце яна прыхарошвала сцяну так доўга, што перасталі на яе звяр-

таць увагу. Была там ці не, калі разбіралі дом і ад’язджалі ў Мястэчка? Невядома. Толькі выплывала на памяць затуманенай, пажаўцелай плямай – брычка, конь, малады фурман сціскае ў далонях ляйчыну, за спіной фурмана пан Стасінак.

– Была такая картачка, праўда, – пацвердзіла бабка Сонька, пакліканая на дапамогу. – Каля царквы, на Ўспенне здымаліся. Прыязджаў фатограф, ці не з Бельска, і здымаліся. А які год – забі, не памятаю. І куды прапала, таксама не ведаю.

– А які быў пан Стасінак? – задаваў Валодзя чарговае пытанне.

– Пан Стасінак? Ах, пан Стасінак. Сын старога пана. Прыгожы. Вочы чорныя, бліскучыя... І конь у яго быў, Султанам клікалі. Белы, як з восеньскай імглы выліты. А як падрываў капыты, як раскідваў грыву! Глядзіш і не ведаеш – дзе канчаецца конь, а дзе пачынаецца вецер...

На ўспамін далёкай маладосці твар бабкі Сонькі святлеў і ўсміхаўся, але чарговая думка сцірала ўсмешку, паварочвала ў смутак:

– Пана Драгабыцкага першыя саветы расстралялі, а Султана зварылі і пасяклі на гуляш другія саветы. І пан Стасінак не выратаваўся. Збег у Варшаву, але там немцы ў паўстанні ўтрупянілі. Але памёр прыгожа. Шаблю ў далоні сціснуўшы, клубком жывой адвагі пайшоў на бяздушную кучу жалеза, якую танкам называюць.

Валодзя вяртаўся да люстэрка, а паўсвятло адвячорка распальвала ў ягоных блакітных вачах чорныя, бліскучыя ліхтарыкі. За дзвярыма шкла і часу ўсё выразней маляваўся прасторны дзядзінец двара пана Драгабыцкага, стайня, фурман Іванюк побач з белым канём...

– Закладай, Уладзімір, Султана ў аглоблі. Махнемся ў свет, на вёску зірнем, – пан Стасінак выходзіў з люстра, асцярожна зачыняў за сабой шкляныя дзверы, садзіўся ў брычку.

І ехалі – у лес, у поле... А таксама на рэчку. У апошняе лета туды якраз часцей. За Старыной, за мосцікам, не даходзячы да пушчы, рэчка запавольвае крок, прыпыняецца шматлікімі паваротамі, утульваецца ў ляшчыны, каліны, дзікія парэчкі. У такім вось месцы сустракаецца пан Стасінак з Сонькай. Сонька заўжды з'яўляецца першая. Распранаецца, заходзіць у рэчку, летняй вадой змывае стому прамінулага дня. Ад сонца, што какетліва ападае ў абдымкі гарызонту, яе аголенае цела наліваецца колерам маладой медзі і спружыністасцю царкоўнага звона. Пан Стасінак падкрадваецца да Сонькі, агортвае спіну, а яна, бы срэбная ртуць, выкоўзваецца з ягоных абдымкаў, абарочваецца, жыватом утульваецца ў ягоны жывот, запускае пальцы ў густую чупрыну і калышацца – уніз і ўверх, уніз і ўверх, аж рэчка, чырвоная вечаровым сорамам, выходзіць з берагоў.

Калі сонца дашчэнту згасае, фурман Уладзімір разгортвае ляшчынавы змрок. І не цікавасць, а празаічны абавязак кіруе яго-нымі рукамі. Мабыць, спынілася хістанне летніх хваляў, мабыць, час закладаць Султана ды вяртацца ў двор. І праўда, рэчка варочаецца ў свае натуральныя берагі, паніч Стасінак выбіраецца з зялёнага кустоўя. Стомленым жэстам супакойвае расчох-раныя, мокрыя валасы.

– Эх, жанчыны. Які ж у мяне клопат з-за іх. Але ж абы адно такія праблемы, – усмі-хаецца, усаджваецца ў брычку. – А ты, Ула-дзімір, ведаеш, што такое жанчына?

Фурман маўчыць, сочыць за сцежкай, што зігзагам заходзіць у сырыя вальшыны. На ўзгорку, калі ўжо колы замацуюцца на цвёрдым грунце, цмокне на Султана, таргане ляйчыну, па звычцы больш, бо Султан, не раз і не два разы змерыўшы гэты шлях, паспеў запісаць у сваю конскую памяць усе неабходныя знакі, што кіруюць у цёплую стайню. За ўзгоркам зверне направа, стукне капытамі аб драўляны мосцік на Палічнай, пераскочыць дваццаць сонных домікаў Старыны, карчму Ёшкі на скры-жаванні Камянецкага і Баранавіцкага гас-цінцаў. Яшчэ кіламетр сасняку, а затым ужо агароды і шырокі дзядзінец двара.

– А ведаеш, Уладзімір? Заўтра мы на рэчку не паедзем, – адзываецца паніч. – І паслязаўтра таксама не. А Соньку ўлад-каваць трэба. Кажа, дзіця ў яе будзе. Замуж

аддаць, бо які тут іншы выхад? Уладзімір!? Падкажы якому кавалеру на вёсцы. Абы не п'яніца ды не гультай, то і кароўку знойдзем, і жыта цэтнераў пяць дакінем. Няхай Сонька мае... А можа, ты сам скарыстаеш? Сонька, кажу табе, не дзеўка, а жывы агонь.

Брычка паглыбляецца ў сосны, маўкліва ўтуленыя адна ў адну на прыход ночы. Колы стукаюць па хрыбтах каранёў, што здрамнулі пад зямлёй. Чуйна спяць карані, у кожны момант яны гатовыя падняцца, кінуцца ў зялёную гонку. Бо адно на хвіліну расступіўся тут лес – каб чалавек, які ідзе гэтай сцежкай ці едзе ў брычцы, змог зазірнуць у рэчку зор, пастаўленую ў берагі, вызначаныя сасновымі вяршынямі.

– Складаныя бываюць лёсы людзей, – сказаў аднойчы маёй маці Стэфаніі мой бацька Валодзя. – Хто мы? Адкуль прыйшлі на свет? Жывем сваім жыццём ці чыімсьці чужым, крадзеным? А ці мае яно сэнс? І ці сапраўднае такое жыццё?

Стэфа глядзела на яго, нічога не разумеючы.

Іншым разам, калі яна вярнулася дадому з вандроўкі па местачковых вуліцах, ён, зазіраючы пад капялюш з жоўтай ружай, падзяліўся:

– Ведаеш? У нашай пані Драгабыцкай было шмат капелюшоў. Белыя, зялёныя і жоўтыя. Летнія, павеўныя, што засланяюць твар ад сонца, і фетравыя, на зімовыя завеі. Ды што я тут.... – спахапіўся раптоўна і, чуй-

на зазіраючы ў вочы Стэфы, працягваў: – У тваёй бабкі, напэўна, не такія капелюшы былі?

– Можа і былі. Напэўна. А ці шмат? – Стэфа адклала капялюш, працягнула руку да паліцы, разгарнула нейкую кніжку. – О, тут ёсць фатаграфія, глянь. Гэта мая бабка Зуза. Сапраўды, капялюсік на галаве. А камянічку, што стаіць за яе спіной, дзед прагуляў потым у карты царскаму палкоўніку, ці генералу.

Напярэдадні калядных або вялікодных святаў Стэфа выштурхоўвала Валодзю ў ларок за мясам. Ішоў туды як на смерць. Ставаў у чаргу, пералічваў людзей наперадзе, а калі дасягаў астранамічнай лічбы ста ці ста дваццаці, прымірыўшыся з бясконцасцю матэматыкі, спыняў падлікі.

– Да вайны, кажуць, дрэнна жылося. Бо паны і беспрацоўе, і хваробы, якія толькі захочаш, і ўсе смяротныя. А чэргі такія ці бачылі ў той час? – пытаў і сам сабе адказваў: – Не бачылі, бо іх не было. Адзін пан Драгабыцкі даваў больш мяса і хлеба, як зараз абы-якая вёска.

– Пане! – схіляўся Валодзя над выпадковым таварышам чэргавай нядолі. І, канспірацыйна зірнуўшы направа-налева, працягваў: – А ў пана Драгабыцкага дзесяткі гектараў залатой пшаніцы было, кароў сотні, а птушак усялякіх – тысячы. А яны, глядзі, пан, што яны змайстравалі? Цьфу! Талончыкі на мяса.

З часам уяўны свет стаў Валодзю бліжэй за рэальны і разважанні пра мінулую славу не пачыналіся ўжо прэлюдыяй “а ў пана Драгабыцкага”. Падчапіўшыся да чаргі, ён некалькі хвілін абходжваў позіркам суседа наперадзе, кідаў нейкае значнае слоўка, каб нарэшце абыякавым, але ўпэўненым голасам паставіць кропку на гэтым прымітыўным, заслуханым заклікамі ўласнага страўніка, натоўпе:

– Эх, настаў час! А калісьці кожны мой продак хутчэй ужо стрэліў бы сабе кулю ў лоб, скарыстаўшы родавы браўнінг, чым пагадзіўся б быць замацаваным у чаргу за дваццаць пяць дэкаграмаў паштэта ў бляшанцы.

– А хто ён такі, ваш продак? – чарга адгукалася зацікаўленнем.

– Пан Драгабыцкі! – адказваў Валодзя. І пералічваў скарбы, накопленыя руплівай працай і эканамічнымі талентамі ранейшых пакаленняў. – За мяжой засталося ўсё, – уздыхаў, спаглядаючы ў той бок, дзе сонца выходзіць на сустрэчу з чарговым днём.

– Пан Драгабыцкі, кажаце, – суразмоўцы чухалі патыліцы, хмурылі бровы, шукаючы ў памяці знаёмы твар або голас. І, нічога не знайшоўшы, паціскалі плячыма: можа і быў такі, хто яго ведае. Паноў як сабак было да вайны.

У такую хвіліну, напароўшыся на паспалітае няшчасце чалавечага роду, неразуменне, Валодзя завязваў вусны стужкай

нятоенай пагарды і змаўкаў канчаткова. Пад глухое бразгатанне насычаных паштэтам бляшанак адступаў ад месца, дзе пакамечылі гонар яго і ягоных продкаў.

Дома з яшчэ большай заўзятасцю ўгрызаўся ў старыя запісы. Аднак, чытаючы іх, часцей ды часцей заходзіўся рогатам, а няшчасныя лісткі паперы заканчвалі жыццё ў палымяным нутры кафлянай печкі.

Спапяліўшы ўсе свае сшыткі, ён перайшоў на паліцы Стэфаніі. Першыя тыдні круціўся там хаатычна, вызначаючы шлях інтуіцыяй, прадчуваннем, залатымі зорамі літар, рассеянымі на небасхіле кніжных хрыбтоў. У кніжках Стэфаніі замыкаўся цалкам іншы свет і нічым не ёнрыпамінаў таго свету, запісанага ім у старых і нават навейшых сшытках. З першага дотыку ён паказаўся халодным і непрыхільным – каменным, быццам асуджаным на вечнасць.

Спатрэбіўся не адзін тыдзень і месяц, каб зразумелася блытаніна вулачак, абкладзеных чэсанымі камянямі, абведзеных маўклівымі камянічкамі, што, у чаканні лепшых дзён, бавяць час, сціраючы пыл з латунных статуэтак і гербавых фарфораў. Гады праз два ён вывучыў гэты свет, як яму здавалася, з першай па апошнюю літару. І ўжо лёгкім крокам, не разглядаючыся па баках, перабягаў тыя вулачкі. Дзверы камяніц адкрываў машынальна, як адчыняюцца дзверы ў свой бацькоўскі дом, а з пакоя ў пакой ступаў упэўнена, поламі пін-

жака не звальваючы на падлогу застылыя ў латуні і фарфоры цацкі.

– Пфі! – сказаў ён сабе аднойчы. – Не такі яе свет і страшны. А ў параўнанні з прасторамі Драгабыцкіх тут няма нічога асаблівага. Мы не горшыя за іх.

Але ўсё-такі свет, запісаны ў кніжках Стэфаніі, даваў Валодзю дзіўную моц. Ён пачаў адчуваць сябе стваральнікам, адзіным такога роду скульптарам, які не з дрэва, не з гліны, а з неназванай, першапачатковай матэрыі высякае сябе самога, сваю ўласную постаць. Абдорвае яе жыццём і надзяляе лёсам.

Чым далей бацька адыходзіў ад рэальнасці, тым часцей маці стала забягаць у касцёл. Раней заходзіла туды за вялікім святам, раз, два разы ў год, а зараз бачылі яе там кожны тыдзень, кожны другі дзень, а затым і штодзень. Сядала і размаўляла са сваімі святымі. Пра што – я не ведаў. Для мяне ўсё было тут новае і незразумелае, і трэба было нерухома сядзець на лаўках, зусім іначай як у царкоўцы, куды часам трапляў за бабкай Сонькай, і дзе ў чаканні прычасця можна размясціцца па правы бок алтара, побач з мярэжнай перагародкай, што аддзяляе хор ад вернікаў, можна таксама стаіцца з левага, жаночага боку, адразу за дзяўчатамі.

Калі дзяўчаты ўкленчвалі, іх кароткія спаднічкі ахоплівалі адно тое, што неабходна, а калі пачыналася адбіванне паклонаў, ад дзявочага гардэроба заставаліся няваж-

ныя шматачкі. Але грэх зазіраць дзяўчатам пад спадніцы, калі да Вялікадня тры або чатыры дні. І тады, высока задзіраючы галаву, можна было сачыць, як пад купал узлятаюць анёлы, шчыльным вяночкам абводзяць архангела Міхала і, прыставіўшы да пульхных вуснаў залатыя трубы, дзьмуць у ягоныя вушы нябеснымі фанфарамі.

У анёлаў былі кароткія і салідныя ногі. Дзякуючы невядомаму маляру, што захапіўся не антычнымі маэстрамі, а дзіўнай сумессю Рубенса з Пікасо, яны нагадвалі постаццю малога Сашку.

У касцёле, задзіраючы галаву, я бачыў толькі белую столь, і заставалася глядзець, як маці шэптам размаўляе з невядомымі святымі, і здагадвацца, што гутарка ідзе пра вяртанне бацькі ў ранейшы свет.

Але каталіцкія святыя не маглі знайсці шлях да душы майго бацькі, бо калі мы вярталіся з касцёла, ён, быццам нічога не здарылася, крочыў з аднаго кута пакоя ў другі кут, паўтараючы адны і тыя словы: “Яшчэ не разгадаліся ўсе загадкі, дрэмлюць яшчэ ў далёкай мінуўшчыне справы, загорнутыя ў чорнае палатно забыцця, і калі зараз не разбудзіць іх, не вывесці пагуляць на свежае паветра, застануцца там назаўсёды”. Аднак, як шукаць шлях у сакрэтны свет, Валодзя не ведаў. Здаралася, пабуджалі яго рухацца ў добрым напрамку размовы з суседзямі. Кожная недаверлівая ўсмешка, поціск плячэй, кожнае насычанае

абыякавасцю “можа і быў, хто яго там ведае”, давалі сілу і вызначалі мэту: пакінуць за сабой у гэтых слоўна-мімічных дыялогах апошняе слова, пасля якога няма ўжо ніякай недагаворанасці і сумненняў.

Ёсць кніжкі, здольныя змяніць калі не гісторыю чалавецтва, то напэўна лёсы паасобных людзей. Гэтая кніжка папалася Валодзю ў рукі вынікам чыстага выпадку. Ліс-тануў адну старонку, другую, трэцюю і, знеахвочаны, ужо адстаўляў яе на паліцу. Вышturхнутая з рук чуйным крылом анёла-ахоўніка, яна шлёпнулася на дыван, раскрылася. З фатаграфіі, гарызантальна расцягнутай на падлозе, глядзеў на Валодзю незнаёмы чалавек. Спазіраў уважліва і адважна. Валодзя прысеў на кукішкі, пальцамі крануў твару на фатаграфіі – асцярожна, як кранаюць вочы чалавека, памерлага хвілінай раней. Але вочы не закрыліся, яны хацелі жыць і з яшчэ большай увагай узіраліся ў Валодзю бліскучымі чорнымі ліхтарыкамі. “Леў Сапега”, – бязгучным шэптам прачытаў прозвішча чалавека на фатаграфіі. “Дзе і калі я бачыў такія вочы? Недзе тут, блізка, учора, сёння... Але ж так, у люстэрку іх бачыў!”, – прыхапіў кніжку і панёсся на сустрэчу з люстрам.

Валодзя трымаў у руках кніжку і не верыў сваім вачам. Праглынуў яе цягам аднае ночы, з раніцы перачытаў другі раз, вечарам трэці. З вечаровай цішыні выразна і рэальна выяўлялася шолахам паперы апошняе

адсутнае звяно пакаленняў.

– Мама, – спытаў бабку Соньку. – А праўда, старэйшая пані Драгабыцкая, ну, маці пана Стасінка, яна з Сапегаў была?

– З Сапегаў? – Сонька пацiснула плячыма. – А чорт яе ведае. З якіхсьці паноў, але як звалі? Можа, Валкавыцкія або Далэнгевічы? А можа і Сапегі, як кажаш. Пад Высокім, зараз яно за граніцай, трымалі маёнтак. І хутчэй за ўсё – небагаты. Стары пан цяляпкаўся часам у госці да дачкі на абдзёртай цялежцы. А конь – куды яму да Султана...

Аднак ва ўяўленні Валодзі скрыпячая цялежка пераўтваралася ў шыкоўную карэту. Бо чалавек, які дасягнуў моцы стваральніка, можа ўсё. Памыляцца і выпраўляць памылкі. Узнагароджваць і караць, а калі з'явіцца капрыз, ён можа сцерці стары быт і пачаць новы, а брычку, даведзеную да непрыдатнага стану, заступіць экіпажам, запрэжаным шасцёркай коней.

Пад восень конскія капыты пачалі выбіваць новы шлях паміж дваром Драгабыцкіх і Высокім. На пачатку элегантныя карэты бегалі на замак Сапегаў раз у тыдзень, затым два разы, тры. З першым снегам карэты пайшлі на спачын, а ў дарогу, штодзённа ўжо, выпраўляліся не менш элегантныя сані. І калі Валодзя напружваў нюх, даходзіў да яго пах конскага поту, і шэсць хамутоў, спятых лейчынамі ў неразлучную еднасць, вырасталі па-над раз'юшанымі

грывамі магутнай струной дышля. Востры зімовы вецер, згушчаны, сціснуты ў віхуру шпаркімі капытамі, граў на гэтай струне бясконцае “у-га-га”. Вясной пан Драгабыцкі павёў панну Сапежанку пад вянец, а выезды прыпыніліся, ахінуліся цішынёй і спакоем сямейнага жыцця. Яшчэ некалькі месяцаў Валодзя сачыў за сцежкамі маладой пары, а калі прыйшоў на свет паніч Стасінак, ён вярнуўся да сучасных праблемаў.

У той дзень, калі Валодзя першы раз спаслаўся на сваіх славутых продкаў Сапегаў, местачкоўцы прапусцілі яго да прылаўка без чаргі.

– Сапегаў ніколі б і ні за што не паставілі ў такую чаргу, – сказаў Валодзя і зрабіў накід маёмасці, якая за апошнія месяцы паспела ўзяць пад сябе ладны фрагмент прасторы і разоў у дзесяць павялічыць жывы інвентар.

– Сотні гектараў залатой пшаніцы, кароў тысячы, а курачак-індыкаў, колькі іх? Адзін Гасподзь мог бы пералічыць. Сам замак у Высокім большы за вашу фабрыку. Па той бок засталося ўсё, за граніцай – уздыхнуў і паказаў рукой на пушчу і змоўк.

– Сапегі, кажаце?! І замак большы за фабрыку?! – суразмоўцы, як і раней, чухалі патыліцы нібыта ўсур’ёз, хмурылі бровы, але вочы адводзілі ў бок і з вуснаў і вачэй маленькімі змеямі сплывалі ўсмешкі. З часам змеі пачалі пераўтварацца ў цёплачорных ластавак спагады, каб, нарэшце,

застыць у халодных камянях абыякавасці.

Ад такіх усмешак дарога да дому выдоўжвалася ў маленькую Галгофу, у шлях пакуты і крыўды. Балючай іголкай даймала шкадаванне за ўсе родавыя браўнінгі, пісталеты, шаблі, у выніку гістарычнай завірухі праваленыя глыбока пад зямлю, адкуль дастаць іх зможа толькі які цуд або чарговая няўдача пані Гісторыі. І зараз ні застрэліць каго, ні сабе кулю ў лоб пусціць. А хацелася прабіць навылет халоднае сэрца пана Стасінка, што для звычайнай выгады аддало яго ў чужыя рукі, і расстраляць мужыцкую прагнасць фурмана Уладзіміра Іванюка, што ялавіцай перакрыла ягоны, Валодзін, жыццёвы шлях, і капітана Жлуктова забіць, і ўсіх іншых невядомых людзей, хто прыклаў руку да ўзнікнення граніцы за Саўчуковай стадолай.

Асабліва даймала граніца. Калі раней яна ляжала на душы халодным лязом, што размяжоўвае на дзве часткі сад пана Драгабыцкага, то цяпер з зааранай паласы падымалася зубатым Цэрберам, шматгаловай гідрай, тупым, непадкупным вартавым, пастаўленым невядома кім і невядома навошта. Ці не з адной мэтай – каб яму, Валодзю, сакрэтнаму сыну паніча Стасінка, а мабыць і ўнуку славутай сапегаўскай дынастыі, зламаць жыццё.